# The Search of Viciebsk Latgale:

# Rethinking a Borderland region from a Transnational perspective

**У пошуках Віцебскай Латгаліі: пераасэнсаванне памежжа з транснацыянальнай перспектывы**

**Meklējot Vitebskas Latgali: robežreģiona pārvērtēšana transnacionālā perspektīvā**

*Academic Workshop Abstracts*

Riga, May 29, 2026

The academic workshop explores an interdisciplinary understanding of the history of Latgale in a broader context, with a specific focus on its period within the Viciebsk Governorate (1772–1917), and its role in shaping cultural, confessional, and national identities on the borderland between present-day Belarus and Latvia.

The primary objective of the workshop is to initiate a scholarly dialogue among researchers from Latvia, Belarus, and Poland in order to conceptualize the phenomenon of Viciebsk Latgale and identify prospects for collaborative research.

## ДЗЯРЖАВА І ЭЛІТЫ • I • VALSTS UN ELITES

**Д-р Ніна Скеп'ян,**
***Беларускі інстытут у Празе***

### Кантакты элітаў ВКЛ з Лівоніяй у святле дыпламатычнай перапіскі першай паловы XVI стагоддзя

У прапанаваным дакладзе праз аналіз дыпламатычнай перапіскі палітычных эліт Вялікага Княства Літоўскага (Гаштольды, Радзівілы) разглядаецца латгальскі рэгіён як функцыянальная памежная зона, у якой адбывалася практычная рэалізацыя палітычных рашэнняў і фармаваліся рознаўзроўневыя кантакты з Лівоніяй. Аснову даследавання складаюць матэрыялы серыі *Elementa ad fontium editiones* (у першую чаргу *Documenta ex Archivo Regiomontano*), а таксама *Akten und*

**Dr. Nina Skepjan,**
***Baltkrievijas institūts Prāgā***

### Lietuvas Lielkunigaitijas elites kontakti ar Livoniju 16. gs. pirmās puses diplomātiskās sarakstes gaismā

Piedāvātajā referātā, analizējot Lietuvas Lielkunigaitijas politiskās elites diplomātisko saraksti (Goštauti, Radvili), Latgales reģions tiek aplūkots kā funkcionāla pierobežas zona, kurā norisinājās politisko lēmumu praktiskā īstenošana un veidojās dažāda līmeņa kontakti ar Livoniju. Pētījuma pamatā ir sērijas *Elementa ad fontium editiones* materiāli (pirmkārt, *Documenta ex Archivo Regiomontano*), kā arī *Akten und Rezesse der livländischen Stände, Liv-, Est- und Kurländisches Urkundenbuch* un *Polockas grāmatas*

*Rezesse der livländischen Stände*, *Liv-, Est- und Kurländisches Urkundenbuch* і *Полацкія граматы XIII – пачатку XVI ст.* Спалучэнне гэтых крыніц дазваляе супаставіць узровень палітычнай камунікацыі эліт з лакальнай практыкай памежнага ўзаемадзеяння.

У дыпламатычнай перапісцы Лівонія выступае як адзіная палітычная прастора (*Livonia*), аднак канкрэтнае функцыянаванне гэтай прасторы лакалізуецца ў яе ўсходняй частцы – латгальскім рэгіёне (Dünaburg, Rositten, Ludsen). Менавіта тут адбываюцца памежныя канфлікты, кантроль за рухам людзей і тавараў і практычная рэалізацыя дыпламатычных рашэнняў. Асаблівую ролю ў гэтых працэсах адыгрывалі вышэйшыя палітычныя эліты ВКЛ, чыя дзейнасць разгортвалася праз лакальныя сеткі. Напрыклад, у перапісцы Альберта Прускага з прадстаўнікамі палітычнай эліты ВКЛ – у тым ліку з Альбертам Гаштольдам, віленскім ваяводам і канцлерам, закранаюцца пытанні рэгулявання межаў, узаемадзеяння з лівонскім бокам і кантролю над памежнымі тэрыторыямі. У рашэннях і абмеркаваннях лівонскіх станаў рэгулярна фігуруюць пытанні бяспекі памежных тэрыторый, узаемадзеяння з суседнімі землямі ВКЛ і кантролю над замкамі і шляхамі камунікацыі. Хоць латгальскі рэгіён не заўсёды вылучаецца як асобная адзінка, менавіта ўсходняя частка Лівоніі выступае як зона найбольш інтэнсіўных кантактаў і канфліктаў.

(13.gs. – 16.gs. sākums). Šo avotu apvienojums ļauj pretstatīt elites politiskās komunikācijas līmeni lokālajai pierobežas mijiedarbības praksei.

Diplomātiskajā sarakstē Livonija parādās kā vienota politiskā telpa (*Livonia*), taču šīs telpas konkrētā funkcionēšana lokalizējas tās austrumu daļā – Latgales reģionā (Dünaburg, Rositten, Ludsen). Tieši šeit norisinās robežkonflikti, cilvēku un preču kustības kontrole, kā arī diplomātisko lēmumu praktiskā realizācija. Īpaša loma šajos procesos bija Lietuvas Lielkunigaitijas augstākajai politiskajai elitei, kuras darbība izvērsās caur lokālajiem tīkliem. Piemēram, Prūsijas Alberta sarakstē ar Lietuvas Lielkunigaitiju politiskās elites pārstāvjiem – tostarp Viļņas vaitaiti un kancleru Albertu Goštautu – tiek skarti jautājumi par robežu regulēšanu, mijiedarbību ar Livonijas pusi un kontroli pār pierobežas teritorijām. Livonijas kārtu lēmumos un diskusijās regulāri figurē jautājumi par pierobežas teritoriju drošību, sadarbību ar kaimiņos esošajām Lietuvas Lielkunigaitijas zemēm un kontroli pār pilīm un komunikācijas ceļiem. Lai gan Latgales reģions ne vienmēr tiek izdalīts kā atsevišķa vienība, tieši Livonijas austrumu daļa kalpo kā intensīvāko kontaktu un konfliktu zona.

Reģiona "neredzamību" diplomātiskajā valodā kompensē lokālā līmeņa materiāli. Polockas grāmatās Latgales telpa parādās kā konkrēti lokalizēta pierobeža, kurā darbojas Polockas vietvalži, bajāri un pilsētnieki. Tā, piemēram, 15.gs. vidus dokumentos fiksēti konflikti saistībā

Гэтая “нябачнасць” рэгіёна ў дыпламатычнай мове кампенсуецца матэрыяламі лакальнага ўзроўню. У *Полацкіх граматах* латгальская прастора паўстае як канкрэтна лакалізаванае памежжа, у якім дзейнічаюць полацкія намеснікі, баяры і мяшчане. Так, у дакументах сярэдзіны XV ст. зафіксаваны канфлікты, звязаныя з канфіскацыяй тавараў полацкіх купцоў і абмежаваннямі гандлю, што выклікала патрабаванні да лівонскага магістра вярнуць маёмасць і забяспечыць свабодны рух купцоў. У іншым выпадку полацкі бок патрабуе прыцягнення да адказнасці комтура Дынабурга (Dünaburg), што дазваляе непасрэдна лакалізаваць канфлікт у межах латгальскага рэгіёна.

Такім чынам, супастаўленне дыпламатычнай перапіскі і лакальных актаў дазваляе вылучыць двухузроўневую мадэль функцыянавання кантактаў: з аднаго боку – узровень вышэйшых палітычных эліт, з другога – узровень памежнай адміністрацыйнай і сацыяльнай практыкі. У гэтай сістэме Латгалія выступае як ключавы рэгіён, праз які палітычныя рашэнні трансфармаваліся ў канкрэтныя формы ўзаемадзеяння. Менавіта таму яе варта разглядаць не як пасіўную перыферыю, а як структурна значны элемент і актыўную прастору, дзе перасякаліся інтарэсы ВКЛ і Лівоніі, а дыпламатычныя дамоўленасці набывалі сваё рэальнае сацыяльна-эканамічнае вымярэнне.

ar Polockas tirgotāju preču konfiskāciju un tirdzniecības ierobežojumiem, kas rosināja Livonijas mestram atdot īpašumu un nodrošināt brīvu tirgotāju kustību. Citā gadījumā Polockas puse pieprasa saukt pie atbildības Dinaburgas komturu, kas ļauj tieši lokalizēt konfliktu Latgales reģiona robežās.

Tādējādi diplomātiskās sarakstes un lokālo aktu salīdzinājums ļauj izdalīt divlīmeņu kontaktu funkcionēšanas modeli: no vienas puses – augstākās politiskās elites līmeni, no otras – pierobežas administratīvās un sociālās prakses līmeni. Šajā modelī Latgales reģions parādās kā galvenā zona, kurā notiek politisko lēmumu transformācija konkrētās mijiedarbības formās. Tieši tāpēc tas būtu jāuztver nevis kā perifērija, bet gan kā aktīvs un strukturāli nozīmīgs elements kontaktu sistēmā starp Lietuvas Lielkunigaitiju un Livoniju. Tas ļauj aplūkot Latgali nevis kā Livonijas perifēriju, bet gan kā aktīvu pierobežas telpu, kurā krustojās Lietuvas Lielkunigaitijas un Livonijas struktūru intereses, bet augstākās politiskās elites kontakti ieguva specifisku sociālekonomisko dimensiju.

**Д-р Эдвардс Селішка,**
*Латвійскі ўніверсітэт*

# Пазіцыя інфлянцкай і віцебскай шляхты адносна гегемоніі Сапегаў у Вялікім Княстве Літоўскім (1683–1700)

Перыяд 1683–1700 гг. у гісторыі Рэчы Паспалітай – гэта час так званай гегемоніі Сапегаў, калі названы род атрымаў беспрэцэдэнтны ўплыў у Вялікім Княстве Літоўскім, кантралюючы як яго войска, так і дзяржаўны скарб. Адначасова канец XVII ст., час пасля Андрусаўскага перамір'я з Расіяй (1667 г.), стаў новым этапам для шляхты, чые землі межавалі з Маскоўскай дзяржавай. Гэта закранула як інфлянцкую (Латгалія), так і віцебскую шляхту.

Жыхары Інфлянтаў, частка якіх была нашчадкамі лівонцаў, што захавалі лаяльнасць Рэчы Паспалітай, пачалі інтэнсіўна ўключацца ў палітычнае жыццё дзяржавы асабліва пасля 1677 г., калі са стварэннем Інфлянцкага ваяводства быў прынамсі часткова вырашаны іх юрыдычны статус. Ён быў няпэўным з канца 1620-х гг., калі Швецыя страціла большую частку Задзвінскага княства (*Pārdaugavas hercogiste*). Віцебскае ваяводства пасля далучэння большай часткі Смаленскага ваяводства да Расіі стала новай радзімай для смаленцаў-эмігрантаў (Аршанскі павет).

**Dr.hist. Edvards Seliška,**
*Latvijas Universitātes*

# Inflantijas un Vitebskas šļahta nostāja attiecībā pret Sapiehu hegemoniju Lietuvas lielkņazistē (1683–1700)

1683.–1700. gads Polijas-Lietuvas vēsturē ir t.s. Sapiehu hegemonijas laiks, kad minētā dzimta ieguva bezprecedenta ietekmi Lietuvas lielkņazistē, kontrolējot gan tās armiju, gan valsts kasi. Vienlaikus 17. gadsimta nogale pēc Andrusovas pamiera noslēgšanas (1667) iezīmēja jaunu posmu Inflantijas (Latgales) un Vitebskas vojevodisti muižniecībai, kuras īpašumi robežojās ar Krievijas caristi.

Inflantijas muižniecība, ko daļēji veidoja Žečpospoļitai lojālo livoniešu pēcteči, valsts politiskajā dzīvē aktīvāk iekļāvās pēc 1677. gada. Līdz ar Inflantijas vojvodistes izveidi tika rasts risinājums to juridiskajam statusam, kas bija palicis neskaidrs kopš 17. gadsimta 20. gadu beigām, kad Zviedrija iekaroja lielāko daļu Pārdaugavas hercogistes teritorijas. Līdz ar Smoļenskas vojevodistes teritoriju zaudēšanu Krievijai Vitebskas vojvodiste, tostarp Oršas apriņķis, funkcionēja kā patvēruma vieta Smoļenskas poļu muižniecības (*šļahtas*) kopienai, veicinot tās tālāku integrāciju reģionā.

Līdz ar to abu vojevodistu muižniecībai tūlīt pēc notikušajām pārmaiņām iekšpolitiski bija jādefinē sava

У сувязі з гэтым шляхта абодвух ваяводстваў адразу пасля перамен павінна была пачаць вызначацца ў сваёй унутрыпалітычнай пазіцыі адносна дамінавання Сапегаў. Для жыхароў Інфлянтаў, як для адносна новых удзельнікаў дзяржаўнай палітыкі, было вельмі важна забяспечыць свае пазіцыі на дзяржаўным узроўні. Таму было важна захоўваць баланс паміж рознымі гульцамі на палітычнай арэне: Сапегамі, іх апанентамі, такімі як Радзівілы (з якімі ў жыхароў Інфлянтаў была шматгадовая традыцыя кліенцкіх адносін), і прыхільным да Інфлянтаў манархам Янам III Сабескім (кіраваў у 1673–1696 гг.).

Адначасова гэта патрабавала добрай інтуіцыі для хуткай пераарыентацыі, калі баланс сіл рэзка змяняўся – ад прасапегаўскай пазіцыі да падтрымкі праціўнікаў Сапегаў. Гэты падыход цікава параўнаць з падыходам віцебскай шляхты, якая мела складаныя адносіны з Сапегамі, улічваючы як знаходжанне ў ваяводстве маёнткаў роду Радзівілаў (Невель), так і зменлівыя адносіны з Сапегамі роду Крышпінаў-Кіршэнштэйнаў, які адыгрываў важную ролю ў Віцебскім ваяводстве і ў палітычнай гісторыі Інфлянтаў гэтага часу.

pozīcija attiecībā uz Sapiehu dzimtas dominējošo ietekmi. Inflantiešiem, kā valsts politikas relatīviem jaunpienācējiem, bija ļoti būtiski nodrošināt savas pozīcijas valsts līmenī. Tādējādi bija būtiski rast līdzsvaru starp dažādiem politiskās arēnas dalībniekiem: Sapiehu dzimtu, viņu oponentiem – piemēram, Radziviliem (ar kuriem Inflantijas muižniecībai bija gadu desmitiem ilga klientārajām attiecībām raksturīga tradīcija) – un monarhu Janu III Sobieski (valdīja 1674–1696), kurš pret inflantiešiem izturējās labvēlīgi.

Politiskā konjunktūra pieprasīja spēju operatīvi pārorientēties, mainoties spēku līdzsvaram starp Sapiehu atbalstītājiem un viņu pretiniekiem. Šo pozicionēšanos ir lietderīgi salīdzināt ar Vitebskas muižniecības rīcību, kuras sarežģītās attiecības ar Sapiehām noteica gan Radzivilu dzimtas īpašumu (piemēram, Neveļas) atrašanās vojevodistē, gan Krišpinu-Kiršenšteinu dzimtas ietekme. Pēdējai bija būtiska loma ne vien Vitebskas vojevodistē, bet arī Inflantijas politiskajos procesos, turklāt tās attiecības ar Sapiehām bija mainīgas.

**Д-р Генрых Сомс,**
***Даўгаўпілскі ўніверсітэт***

## Мясцовае кіраванне ў латвійскіх паветах Віцебскай губерні: 1861–1917

Пасля скасавання прыгоннага права ў Расіі 19 лютага 1861 г. у Латгаліі (на латышскіх тэрыторыях Віцебскай губерні – Дзвінскі, Рэжыцкі, Люцынскі паветы) было заснавана сялянскае валасное самакіраванне. У Латгаліі кожны селянін павінен быў быць прыпісаны да нейкай воласці. Асаблівасцю Латгаліі было тое, што сяляне маёнткаў, фальваркаў ці іншых тэрыторый, аб'яднаных у адну воласць, захоўвалі пэўныя функцыі самакіравання на сваёй зямлі і пасля ліквідацыі прыгоннага права. Фармавалася своеасаблівае двухузроўневае самакіраванне: сельскія грамады і воласць, якая аб'ядноўвала сялян некалькіх маёнткаў. Сельская грамада (паняцце не тоеснае словам "вёска" ці "сяло", што часам сустракаюцца ў гістарычнай літаратуры) складалася з сялян, якія пражывалі на землях, што належалі аднаму памешчыку. Гэта маглі быць цэлыя сёлы, вёскі, іх часткі або асобныя паселішчы – дамы, хутары. Некалькі такіх грамадаў утваралі воласць.

Органамі валаснога кіравання былі валасны сход, валасны старшыня і праўленне. У валасным сходзе ўдзельнічалі выбраныя службовыя асобы, сельскія

**Dr.hist. Henrihs Soms,**
***Daugavpils Universitātes***

## Pagastu pārvalde Vitebskas guberņas latviešu apriņķos: 1861–1917

Pēc dzimtbūšanas atcelšanas Krievijas impērijā 1861. gada 19. februārī Latgalē (Vitebskas guberņas latviešu apriņķos – Daugavpils, Rēzeknes un Ludzas) tika nodibināta zemnieku kārtas pagasta pašvaldība. Latgalē katram zemniekam bija jābūt piederīgam pie konkrētas pagasta kopienas. Reģionam raksturīga īpatnība bija divpakāpju pašvaldības sistēmas izveide: vienā pagastā apvienoto muižu vai folverku zemnieki saglabāja lokālas pašpārvaldes funkcijas savas muižas ietvaros. Šo sistēmu veidoja lauku sabiedrības (seļskoje obščestvo) un pagasts (volostj), kas apvienoja vairāku muižu zemniekus. Lauku sabiedrību veidoja viena muižnieka īpašumā esošie zemnieki – tie varēja būt ciemi, sādžas vai atsevišķas viensētas. Vairākas šādas sabiedrības kopā veidoja pagasta administratīvo vienību.

Pagasta pārvaldes struktūru veidoja pagasta sapulce, pagasta vecākais un valde. Pagasta sapulces sastāvā ietilpa vēlētās amatpersonas un saimnieku pilnvarotie pārstāvji — desmitnieki, kurus ievēlēja pēc principa: viens pārstāvis no desmit saimniecībām. Kalpi un babuļnieki deleģēja vienu pārstāvi no 20 cilvēkiem. Pagasta sapulce vēlēja pagasta amatvīrus un tiesnešus, gādāja par visa pagasta vajadzībām

дзесятнікі (ад 10 двароў – адзін). Батракі і беззямельныя сяляне дэлегавалі аднаго прадстаўніка ад 20 чалавек. Валасны сход абіраў валасных службовых асоб і суддзяў, клапаціўся пра патрэбы і гаспадарку ўсёй воласці, пра школы, вызначаў і размяркоўваў падаткі і павіннасці, назіраў за дзейнасцю службовых асоб і г.д. Валасны старшыня быў кіраўніком воласці, якому падпарадкоўваліся старасты. Валасны старшыня ў межах сваёй воласці выконваў паліцэйскія абавязкі, склікаў сход, выконваў яго рашэнні, вёў падатковыя справы, кіраваў валасной маёмасцю, казной і выконваў іншыя функцыі. Валасны старшыня разам са старастамі і сваімі памочнікамі складалі валасное праўленне (валасную кантору), якое вырашала бягучыя справы. У 1880 г. у Латгаліі была 51 воласць (у Дзвінскім павеце – 16, Люцынскім – 16, Рэжыцкім – 19), у якіх было аб'яднана 232 сельскія таварыствы (у Дзвінскім – 96, Люцынскім – 66 і Рэжыцкім – 70). Асаблівасцю Латгаліі былі буйныя воласці са значнай колькасцю насельніцтва, таму ствараліся новыя воласці. Гэты працэс працягваўся аж да 1940 г.

Функцыянаванне валаснога кіравання ў Латгаліі ў навуковай літаратуры даследавана мала. Не створаны таксама і спіс валасных старшынь. З гэтага пункту гледжання актуальным з'яўляецца пытанне звароту да архіўных звестак і юрыдычных дакументаў, якія звязаны з Віцебскай губерняй.

un saimniecību, par skolām, noteica un sadalīja nodokļus un klaušas, pārraudzīja amatvīru darbību utt. Pagasta vecākais (*staršina*) bija pagasta priekšnieks, kura pakļautībā bija stārasti. Pagasta vecākais pildīja administratīvās un policijas funkcijas, nodrošinot pagasta sapulces darbību un lēmumu realizāciju. Tāpat pagasta vecākais bija atbildīgs par nodokļu administrēšanu, pagasta mantas un finanšu līdzekļu apsaimniekošanu. Pagasta izpildvaru īstenoja valde, kuras sastāvā ietilpa vecākais, viņa palīgi un stārasti. Šī institūcija, kas vēsturiskajos avotos minēta arī kā pagasta kantoris, nodrošināja pašvaldības tekošo lietu kārtošanu un administratīvo nepārtrauktību. 1880. gadā Latgalē bija 51 pagasts (Daugavpils apriņķī – 16, Ludzas – 16, Rēzeknes – 19), kuros bija apvienotas 232 lauku sabiedrībās (Daugavpils apriņķī – 96, Ludzas – 66 un Rēzeknes – 70). Latgales reģionam bija raksturīgas plašas pagastu teritorijas ar ievērojamu iedzīvotāju skaitu, tādēļ tika uzsākta to pakāpeniska sadalīšana un jaunu administratīvo vienību izveide. Šis teritoriālās optimizācijas process turpinājās līdz pat 1940. gadam.

Latgales pagastu pārvaldes darbība zinātniskajā literatūrā līdz šim ir pētīta nepietiekami, turklāt vēstures zinātnē nav apkopoti pilnīgi pagasta vecāko saraksti. Tādēļ ir nepieciešams pievērsties Vitebskas guberņas arhīvu liecībām un juridisko dokumentu analīzei, kas ļauj rekonstruēt pašvaldību funkcionēšanas mehānismus un to personālsastāvu.

**Мгр. Улдыс Ванагс,**
***Латвійскі нацыянальны архіў Латвійскі дзяржаўны гістарычны архіў***

## Прававая асаблівасць Латгаліі на пачатку XX стагоддзя

Латгалія дагэтуль лічыцца найменш даследаваным гістарычным рэгіёнам Латвіі, а таксама адным з самых своеасаблівых нароўні з Ліўскім берагам. У гістарыяграфіі назіраецца тэндэнцыя інтэрпрэтаваць гэты рэгіён у межах розных нацыянальных наратываў: у Латвіі і Расіі ён часта разглядаецца як частка расійскай прасторы, у Беларусі падкрэсліваецца ўдзельная вага беларускага насельніцтва, а ў Польшчы ўспрымаецца як частка гістарычнай спадчыны Рэчы Паспалітай. Гэтыя погляды часткова абгрунтаваныя, але няпоўныя. Даклад прапануе разгледзець Латгалію як унікальную гістарычную і прававую з’яву ў рэгіёне, спецыфіка якой захоўвалася аж да 1919 г.

У аснове даследавання ляжыць здагадка, што для разумення гістарычных працэсаў рэгіёну недастаткова кіравацца дамінуючымі палітычнымі ці грамадскімі ўяўленнямі. Істотнае значэнне маюць лакальныя звычаі і прававое рэгуляванне. У адрозненне ад сучаснага прававога мыслення, дзе дамінуе прыярытэт актуальнага закона і перарыванне пераемнасці нормаў, да 1919 г.

**Mg. Uldis Vanags,**
***Latvijas Nacionālais arhīva***
***Latvijas valsts vēstures arhīva***

## Latgales tiesiskā savdabība 20. gadsimta sākumā

Latgale arvien ir uzskatāma par vismazāk pētīto vēsturisko Latvijas novadu, kā arī par vienu no vissavdabīgākajiem līdzās Lībiešu krastam. Historiogrāfijā vērojama tendence šo reģionu interpretēt dažādu nacionālo naratīvu ietvaros: Latvijā un Krievijā tas bieži tiek skatīts kā Krievijas telpas daļa, Baltkrievijā uzsvērts baltkrievu iedzīvotāju īpatsvars, savukārt Polijā – kā Polijas–Lietuvas vēsturiskā mantojuma sastāvdaļa. Šie skatījumi ir daļēji pamatoti, taču nepilnīgi. Referāts piedāvā aplūkot Latgali kā unikālu tiesiski vēsturisku parādību reģionā, kuras specifika saglabājas līdz pat 1919. gadam.

Pētījuma pamatā ir pieņēmums, ka reģiona vēsturisko procesu izpratnei nepietiek ar dominējošajiem politiskajiem vai sabiedriskajiem priekšstatiem. Būtiska nozīme ir lokālajām paražām un tiesiskajam regulējumam. Atšķirībā no mūsdienu tiesiskās domāšanas, kur dominē aktuālā likuma prioritāte un normu pēctecības pārtraukšana, līdz 1919. gadam tiesību kolīzijas bieži tika risinātas, balstoties uz vēsturiski uzkrātu monarhisku leģitimitāti.

прававыя калізіі часта вырашаліся, грунтуючыся на гістарычна назапашанай манархічнай легітымнасці.

У выпадку Латгаліі яшчэ ў пачатку XX ст. захоўваецца шматслойная прававая спадчына, якая ўключае не толькі нарматыўныя акты Расійскай імперыі і рэлікты заканадаўства Рэчы Паспалітай, але і элементы эпохі Лівонскай канфедэрацыі. Гэтая нарматыўная шматслойнасць стварае ўнікальнае прававое асяроддзе, якое не мае прамых аналагаў у іншых рэгіёнах.

Асабліва значнай крыніцай з'яўляюцца нарматыўныя акты вышэйшага ўзроўню, падпісаныя манархам, у якіх сустракаецца фармулёўка "латышскія паветы Віцебскай губерні". Гэта пацвярджае, што нават у межах імперыі прызнавалася адміністрацыйная і этнічная самабытнасць гэтай тэрыторыі.

На рубяжы стагоддзяў Латгалія перажывае імклівыя змены, аднак захоўваюцца і спецыфічныя рысы. У Дзвінскім павеце існуюць асобныя спісы латышскіх выбаршчыкаў у Дзяржаўную думу Расійскай імперыі; выкарыстоўваюцца адзіныя з іншымі рэгіёнамі Латвіі бланкі перапісу насельніцтва; у жандармерыі існуе спецыяльная пасада для працы ў "латышскіх паветах". Тэрытарыяльна варта вылучыць і феномен Грывы, якая, будучы цесна звязанай з Даўгаўпілсам, адміністрацыйна ўваходзіла ў склад Курляндскай губерні.

Спецыфіка Латгаліі выяўляецца і ў сферы прыватнага права, у тым ліку ў рэгуляванні саслоўнага

Latgales gadījumā vēl 20. gadsimta sākumā saglabājas daudzslāņains tiesiskais mantojums, kas ietver ne tikai Krievijas impērijas normatīvos aktus un Rečpospoļitas reliktus, bet arī Livonijas konfederācijas laikmeta elementus. Šī normatīvā slāņainība veido unikālu tiesisko vidi, kurai nav tiešu analogu citos reģionos.

Īpaši nozīmīgs avots ir augstākā līmeņa normatīvie akti, kurus parakstījis monarhs, kuros sastopams formulējums "Vitebskas guberņas latviešu apriņķi". Tas apliecina, ka arī impērijas ietvaros tika atzīta šīs teritorijas administratīvā un etniskā savdabība.

Gadsimtu mijā Latgale piedzīvo straujas pārmaiņas, tomēr saglabājas arī specifiskas iezīmes. Daugavpils apriņķī pastāv atsevišķi latviešu vēlētāju saraksti Krievijas impērijas Valsts domei; tiek izmantotas vienotas tautas skaitīšanas veidlapas ar pārējiem Latvijas novadiem; žandarmērijā pastāv īpašs amats darbam "latviešu apriņķos". Teritoriāli izceļams arī Grīvas fenomens, kas, būdama cieši saistīta ar Daugavpili, administratīvi ietilpst Kurzemes guberņā.

Latgales specifika izpaužas arī privāttiesību jomā, tostarp kārtu pārstāvniecības un civiltiesisko attiecību regulējumā. Lai gan Krievijas impērija tiecas uz pilnīgu administratīvu un tiesisku unifikāciju, šis process līdz galam netiek īstenots. Līdz ar to Latgale piedāvā unikālu iespēju analizēt impērijas unifikācijas politikas mehānismus ilgtermiņā.

прадстаўніцтва і грамадзянска-прававых адносін. Хоць Расійская імперыя імкнулася да поўнай адміністрацыйнай і прававой уніфікацыі, гэты працэс не быў даведзены да канца. Такім чынам, на прыкладзе Латгаліі можна вывучыць, як дзейнічалі механізмы імперскай уніфікацыі ў доўгатэрміновай перспектыве.

**Д.г.н. Віктар Шадурскі,**
***Уроцлаўскі ўніверсітэт***

## Верхнядзвінскі раён – Краслаўскі край: выклікі і патэнцыял беларуска-латвійскага памежжа

Тэрытарыяльныя ўтварэнні дзвюх краін, якія маюць дзясяткі кіламетраў агульнай мяжы, сёння падзяляюць напружаныя міждзяржаўныя адносіны і прыналежнасць Беларусі і Латвіі да варагуючых ваенна-палітычных блокаў. Разам з тым два рэгіёны аб’ядноўвае агульная гісторыя, культурныя традыцыі, актыўныя эканамічныя і чалавечыя кантакты, якія развіваліся да жніўня 2020 г., і шмат іншага. Пра вялікі патэнцыял супрацоўніцтва сведчыць гісторыя адносін Краславы і Верхнядзвінска, праз якія праходзяць найважнейшыя транспартныя артэрыі (чыгунка і аўтамабільная дарога), працякае Заходняя Дзвіна–Даўгава. Абедзве тэрыторыі маюць падобную плошчу і колькасць насельніцтва: Верхнядзвінскі раён (плошча 2136 км$^2$, колькасць насельніцтва (на 1 студзеня 2026 г.) – 17 875 чалавек. Краслаўскі край (плошча – 2289 км$^2$, насельніцтва (на 2021 г.) – 23 624 чалавекі).

Узаемныя кантакты паміж суседнімі рэгіёнамі, нягледзячы на адрозненне палітычных рэжымаў іх краін, развіваліся па многіх кірунках. Краслаўскі край

**Dr. habil. hist. Viktar Shadurski,**
***Vroclavas Universitāte***

## Vjerhņadzvinskas rajona un Krāslavas novada starpreģionālo attiecību dinamika: no sadarbības līdz konfrontācijai

Abu valstu teritoriālās vienības, kurām ir desmitiem kilometru gara kopēja robeža, pašlaik šķir saspīlētas starpvalstu attiecības un Baltkrievijas un Latvijas piederība savstarpēji naidīgiem militāri politiskiem blokiem. Vienlaikus abus reģionus vieno kopīga vēsture, kultūras tradīcijas, kā arī aktīvi ekonomiskie un personiskie kontakti, kas attīstījās līdz 2020. gada augustam. Par ievērojamo sadarbības potenciālu liecina Krāslavas un Vjerhņadzvinskas attiecību vēsture – caur šīm pilsētām stiepjas nozīmīgas transporta artērijas (dzelzceļš un autoceļi) un plūst Rietumu Dvina-Daugava. Abām teritorijām ir līdzīga platība un iedzīvotāju skaits: Vjerhņadzvinskas rajons (platība 2136 km$^2$, iedzīvotāju skaits uz 2026. gada 1. janvāri – 17 875 cilvēki), Krāslavas novads (platība 2289 km$^2$, iedzīvotāju skaits 2021. gadā – 23 624 iedzīvotāji).

Savstarpējie kontakti starp kaimiņu reģioniem, par spīti to pārstāvēto valstu politisko režīmu atšķirībām, attīstījās daudzos virzienos. Krāslavas novads daudziem baltkrieviem kļuva par "logu" uz Eiropas Savienību, zināšanu un pieredzes avotu teritorijas demokrātiskajā transformācijā,

стаў для многіх беларусаў “акном” у Еўрапейскі саюз, крыніцай ведаў і досведу дэмакратычнай трансфармацыі тэрыторыі, якая ў пачатку 1990-х гг. мела з Верхнядзвінскім раёнам падобныя стартавыя ўмовы. Да лета 2020 г. аб узаемных ініцыятывах падрабязна пісала мясцовая прэса. Напрыклад, у газеце “Дзвінская праўда” рэгулярна выходзілі артыкулы пад назвай “Сяброўства не ведае межаў” (27.07.2018), паведамлялася пра ўдзел дэлегацыі Верхнядзвінскага раёна на чале са старшынёй райвыканкама Ігарам Маркавічам у святкаванні Дня горада Краславы (28.07.2015). Пасля падаўлення беларускай рэвалюцыі раённая газета па камандзе зверху цалкам ператварылася ў рупар прапаганды і дэзынфармацыі.

Агрэсіўны характар беларускага рэжыму выяўляецца ў тым, што пры падтрымцы Крамля Беларусь стала для суседніх краін, у тым ліку Латвіі, крыніцай вайсковых і гібрыдных пагроз. Паблізу ад беларускіх межаў рэгулярна праходзяць беларуска-расійскія вайсковыя вучэнні, якія маюць яскрава выражаную антыеўрапейскую скіраванасць. З тэрыторыі Верхнядзвінскага раёна працягваюцца шматлікія спробы нелегальнага перасячэння латвійскай мяжы пры падтрымцы беларускіх памежнікаў. Не спыняюцца кантрабандныя злачынствы. Такая палітыка наносіць урон не толькі суседняй краіне, але мае сур’ёзныя негатыўныя наступствы для саміх беларусаў.

kurai 1990. gadu sākumā bija līdzīgi sākuma nosacījumi kā Vjerhņadzvinskas rajonam. Līdz 2020. gada vasarai par abpusējām iniciatīvām detalizēti rakstīja vietējā prese. Piemēram, laikrakstā “Дзвінская праўда” (latviešu valodā: “Dvinskas patiesība”) regulāri tika publicēti raksti ar nosaukumu “Draudzība nezina robežas” (27.07.2018), ziņojot par Vjerhņadzvinskas rajona delegācijas dalību Krāslavas pilsētas svētkos rajona izpildkomitejas priekšsēdētāja Igora Markoviča vadībā (28.07.2015). Pēc Baltkrievijas revolūcijas apspiešanas rajona laikraksts pēc augstākstāvošu iestāžu pavēles pilnībā transformējās par propagandas un dezinformācijas ruporu.

Baltkrievijas režīma agresīvais raksturs izpaužas apstāklī, ka ar Kremļa atbalstu valsts kaimiņvalstīm, tostarp Latvijai, tā ir kļuvusi par militāro un hibrīdapdraudējumu avotu. Baltkrievijas robežu tuvumā regulāri norisinās Baltkrievijas un Krievijas militārās mācības ar izteikti pret Eiropu vērstu ievirzi. No Vjerhņadzvinskas rajona teritorijas ar Baltkrievijas robežsargu atbalstu turpinās daudzkārtēji mēģinājumi nelegāli šķērsot Latvijas robežu. Nerimst arī kontrabandas noziegumi. Šāda politika nodara kaitējumu ne tikai kaimiņvalstij, bet rada nopietnas negatīvas sekas pašiem baltkrieviem.

Ir acīmredzams, ka abu kaimiņu reģionu sadarbības potenciāls tiks pilnībā realizēts tikai pēc Baltkrievijas diktatūras beigšanas, kas pašlaik ir galvenais šķērslis

Відавочна, што патэнцыял супрацоўніцтва двух суседніх рэгіёнаў будзе раскрыты пасля падзення беларускай дыктатуры, якая з’яўляецца галоўнай перашкодай для наладжвання канструктыўных дзяржаўных, грамадскіх і чалавечых кантактаў.

konstruktīvu valstisko, sabiedrisko un personisko kontaktu izveidei.

**Мгр. Андрыс Ушканс,**
***Даўгаўпілскі ўніверсітэт***

## Забудова і насельніцтва Рэзэкнэ да адкрыцця аўтамагістралі Санкт-Пецярбург–Варшава

1830-я гг. былі для Рэзэкнэ вырашальнымі. Паводле перапісу насельніцтва 1825 г. у горадзе была зарэгістравана рэкордна нізкая колькасць жыхароў – 205 чалавек, а ў 1832 г. генерал-губернатар беларускіх губерняў прапанаваў выключыць Рэзэкнэ са спісу павятовых гарадоў. Імператар пакінуў гэта без увагі, аднак прыкладна ў той жа час у імператарскую канцылярыю паступіла прашэнне ад мясцовых купцоў і мяшчан з просьбай дазволіць ставіць дамы ўздоўж новай шашы, што будавалася. У 1836 г. Мікалай I зацвердзіў новы гарадскі план, і калі ў 1833 г. колькасць жыхароў горада складала 745 чалавек, то ў 1860-м яна дасягнула ўжо 3 100, а яшчэ праз дваццаць гадоў перавысіла дзесяць тысяч.

Аналізуючы пісьмовыя і візуальныя крыніцы з Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіва Расійскай Федэрацыі і Латгальскага культурна-гістарычнага музея, у дакладзе разглядаецца забудова і склад насельніцтва

**Mg. Andris Uškāns,**
***Daugavpils Universitātes***

## Rēzeknes apbūves struktūra un iedzīvotāji pirms Sanktpēterburgas – Varšavas šosejas atklāšanas

19. gadsimta 30. gadi kļuva par izšķirošu posmu Rēzeknes pilsētvides un administratīvās nozīmes attīstībā. Saskaņā ar 1825. gada datiem Rēzeknē bija fiksēts kritiski zems iedzīvotāju skaits – tikai 205 personas, – tādēļ 1 832. gadā Baltkrievijas ģenerālgubernators ierosināja svītrot Rēzekni no apriņķa pilsētu saraksta. Imperators to atstāja bez uzmanības, taču ap šo pašu laiku imperatora kancelejā nonāca Rēzeknes tirgotāju un sīkpilsoņu iesniegums, kurā tika lūgta atļauja apbūvēt teritorijas gar jaunbūvējamo maģistrālo šoseju. 1836. gadā Nikolajs I apstiprināja jauno pilsētas plānu. Iedzīvotāju skaits, kas 1833. gadā bija vien 745 cilvēki, 1860. gadā sasniedza jau 3 100, bet vēl pēc divām desmitgadēm pārsniedza desmit tūkstošu robežu.

Balstoties uz Krievijas Federācijas Centrālā valsts vēstures arhīva un Latgales Kultūrvēstures muzeja rakstīto un vizuālo avotu analīzi, darbā pētīta Rēzeknes apbūve un iedzīvotāju sastāvs ap 1834. gadu – periodā, kad pilsētas

Рэзэкнэ каля 1834 г., калі лёс горада яшчэ не быў вызначаны, аднак уплыў новай шашы ўжо быў бачны нават у структуры горада.

statuss vēl bija neskaidrs, taču jaunbūvējamās šosejas ietekme jau sāka pārveidot pilsētas struktūru.

**Д-р Ігар Бортнік,**
***Інтытут гісторыі ПАН***

## Латгалія як памежжа ідэнтычнасцяў у палітычнай думцы Баляслава Ліманоўскага

Баляслаў Ліманоўскі (1835–1935) быў вядомым польскім палітычным дзеячам, гісторыкам і сацыёлагам другой паловы XIX і першай траціны XX стст. Яго дзяцінства прайшло пераважна на тэрыторыі Латгаліі, у сямейным шляхецкім маёнтку Падгор'е Люцынскага павета.

Жыццёвы досвед у шматэтнічным і шматмоўным памежным рэгіёне аказаў істотны ўплыў на палітычную думку Баляслава Ліманоўскага. Дадзенаму рэгіёну была прысвечана яго першая друкаваная праца "Лісты з Інфлянтаў", выдадзеная ў 1860 г. у выданні "Przegląd Rzeczy Polskich". У той час ён ідэнтыфікаваў сябе адначасова як літвін і як інфлянцец, сваімі сталіцамі лічыў як Вільню, так і Рыгу. Пры гэтым у дадзеныя паняцці ўкладваўся не этнічны, а гісторыка-палітычны сэнс. У канцы 1870-х гг. вызначаў сябе як "паляк, народжаны сярод латышскага насельніцтва". Адзначаная ідэнтыфікацыя стала ў значнай ступені падмуркам для ідэі адроджанай Рэчы Паспалітай як дэмакратычнай федэрацыі, пры ўмове прызнання беларусаў, латышоў, літоўцаў і ўкраінцаў самастойнымі народамі, якія маюць

**Dr. Ihar Bortnik,**
***Polijas Zinātņu akadēmijas Vēstures institūts***

## Latgale kā identitāšu pierobeža Boļeslava Limanovska politiskajā domā

Boļeslavs Limanovskis (*Bolesław Limanowski*, 1835.–1935. gads) bija ievērojams poļu politiskais darbinieks, vēsturnieks un sociologs 19. gs. otrajā pusē un 20. gs. pirmajā pusē. Viņa bērnība noritēja galvenokārt Latgales teritorijā, dzimtas muižā Podgurjē (*Podgórze*), Ludzas apriņķī.

Dzīves pieredze multietniskā un daudzvalodīgā pierobežas reģionā atstāja būtisku ietekmi uz Boļeslava Limanovska politisko domāšanu. Šim reģionam tika veltīts viņa pirmais iespiestais darbs "Vēstules no Inflantijas" (*Listy z Inflant*), kas 1860. gadā tika publicēts izdevumā *Przegląd Rzeczy Polskich*. Tobrīd viņš sevi identificēja vienlaikus gan kā lietuvieti (litwin), gan kā inflantieti (*inflanczyk*), par savām galvaspilsētām uzskatot gan Viļņu, gan Rīgu. Turklāt šajos jēdzienos tika ietverta nevis etniska, bet gan vēsturiski politiska nozīme. 1870. gadu beigās viņš sevi definēja kā "latviešu apdzīvotā vidē dzimušu poli". Šāda identifikācija lielā mērā kļuva par pamatu idejai par atjaunotu Polijas-Lietuvas kopvalsti (*Rzeczpospolita*) kā demokrātisku federāciju, ar nosacījumu, ka baltkrievi, latvieši, lietuvieši un ukraiņi tiek atzīti par patstāvīgām tautām ar tiesībām uz savu valstiski politisko un nacionāli kulturālo attīstību (par

права на ўласнае дзяржаўна-палітычнае і нацыянальна-культурнае развіццё (у якасці мадэлі дзяржаўнага аб’яднання разглядалася Швейцарыя). Дэкларавалася падтрымка нацыянальных рухаў гэтых народаў і апякунства над імі (з-за адсутнасці заўважнай праслойкі адукаваных слаёў грамадства гэтых народаў) з боку прагрэсіўнай польскай інтэлігенцыі. Ідэалізаваным узорам выступала пры гэтым іншая вядомая польская дзяячка – ураджэнка Латгаліі Эмілія Плятэр, якая, паводле яго слоў, “любіла як латышскі, так і беларускі народы, і спачувала іх нядолі”.

Дадзеныя погляды знайшлі сваё развіццё ў палітычнай думцы Баляслава Ліманоўскага на працягу ўсяго яго жыцця. Ён высока ацаніў ролю латышскага, беларускага і літоўскага нацыянальных рухаў падчас рэвалюцыі 1905–1907 гг., разлічваў на перспектывы цеснага супрацоўніцтва паміж імі і польскім нацыянальным рухам. У 1912 г. быў апублікаваны артыкул Баляслава Ліманоўскага “Літва і Беларусь”, у якім сцвярджаўся аптымістычны погляд на нацыянальна-палітычныя перспектывы развіцця беларускага народу. Спецыфічным момантам у канцэпцыі федэратыўнай Рэчы Паспалітай было тое, што яе неад’емным суб’ектам, разам з Польшчай, Беларуссю, Літвой (і Украінай), заўсёды бачылася Латвія. Баляслаў Ліманоўскі дапускаў нават перспектыву незалежнай ад Польшчы беларуска-літоўска-латышскай федэрацыі. Стварэнне ўнітарнай

valstiskās apvienības modeli tika izraudzīta Šveice). Tika deklarēts atbalsts šo tautu nacionālajām kustībām un progresīvās poļu inteliģences aizbildniecība pār tām (ņemot vērā ievērojama izglītoto slāņu trūkumu šajās etniskajās grupās). Kā idealizēts paraugs šajā kontekstā tika izcelta cita ievērojama poļu darbiniece – Latgalē dzimusī Emīlija Plātere, kura, pēc viņa vārdiem, “mīlēja gan latviešu, gan baltkrievu tautu un juta līdzi to bēdām”.

Šie uzskati guva attīstību Boļeslava Limanovska politiskajā domā visa viņa mūža garumā. Viņš augstu novērtēja latviešu, baltkrievu un lietuviešu nacionālo kustību lomu 1905.–1907. gada revolūcijā, paļaujoties uz ciešas sadarbības perspektīvām starp tām un poļu nacionālo kustību. 1912. gadā tika publicēts Boļeslava Limanovska raksts “Lietuva un Baltkrievija”, kurā pausts optimistisks skatījums uz baltkrievu tautas nacionāli politiskās attīstības perspektīvām. Specifisks aspekts federatīvās Žečpospoļitas koncepcijā bija tas, ka par tās neatņemamu subjektu līdzās Polijai, Baltkrievijai, Lietuvai (un Ukrainai) vienmēr tika uzskatīta arī Latvija. Boļeslavs Limanovskis pieļāva pat no Polijas neatkarīgas baltkrievu-lietuviešu-latviešu federācijas iespējamību. Unitāras valsts izveidi starpkaru Polijā viņš uzskatīja par savu federālisma ideju sabrukumu. Šajos apstākļos, būdams Polijas Republikas senators, viņš lielu nozīmi piešķīra nacionālo mazākumtautību tiesību nodrošināšanai un nacionālās diskriminācijas nepieļaujamībai.

дзяржавы ў міжваеннай Польшчы ён разглядаў як крах сваіх федэралістычных ідэй. У гэтых умовах, у якасці сенатара Польскай Рэспублікі ён надаваў вялікую ролю забеспячэнню правоў нацыянальных меншасцяў і недапушчальнасці дыскрымінацыі па нацыянальнай прыкмеце.

Такім чынам, можна сцвярджаць, што жыццёвы досвед на памежжы ідэнтычнасцяў у Латгаліі стаў штуршком да фарміравання ідэй дэмакратычнага федэралізму і прызнання нацыянальнага раўнапраўя ў палітычнай думцы Баляслава Ліманоўскага. У пэўным сэнсе яго ідэі былі сугучныя з поглядамі прадстаўнікоў краёвага руху на землях былога Вялікага Княства Літоўскага, таксама сфарміраванымі ва ўмовах шматэтнічнага памежнага рэгіёна. Адметнай рысай у палітычнай думцы Баляслава Ліманоўскага было рашучае ўключэнне ўсёй Латвіі ў межы палітычнай і культурнай прасторы праектуемай федэратыўнай Рэчы Паспалітай.

Tādējādi var apgalvot, ka dzīves pieredze identitāšu pierobežā, Latgalē, kļuva par impulsu demokrātiskā federālisma ideju veidošanai un nacionālās līdztiesības atzīšanai Boļeslava Limanovska politiskajā domā. Zināmā mērā viņa idejas saskanēja ar novadnieku (*krajovcy*) kustības pārstāvju uzskatiem bijušās Lietuvas Lielkunigaitijas zemēs, kas arī bija veidojušies multietniska pierobežas reģiona apstākļos. Atšķirīga iezīme Boļeslava Limanovska politiskajā domā bija visas Latvijas izlēmīga iekļaušana projektētās federatīvās Polijas-Lietuvas kopvalsts politiskajā un kultūras telpā.

**Д-р Максім Каралёў,**
***Беларускі інстытут у Празе***

## Нацыянальнае самавызначэнне насельніцтва Латгаліі ў першай чвэрці XX стагоддзя

Даследаванні нацыяналізму ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе традыцыйна развіваліся ў рамках мадэляў нацыятварэння (Miroslav Hroch, Benedict Anderson, Ernest Gellner), якія апісваюць нацыяналізацыю як адносна паслядоўны і лінейны працэс. У апошнія дзесяцігоддзі гэтыя падыходы былі істотна пераасэнсаваныя ў працах Tara Zahra, Pieter Judson, Maarten Van Ginderachter, якія прапанавалі канцэпцыю "нацыянальнай абыякавасці" (*national indifference*) і падкрэслілі разрыў паміж нацыянальнымі праектамі і практыкамі паўсядзённасці.

Латгалія як гістарычнае памежжа не можа быць адэкватна зразуметая праз прызму лінейнай нацыяналізацыі. Замест гэтага на яе трэба глядзець як на прастору, дзе нацыянальныя праекты (латышскі, латгальскі, польскі, беларускі і інш.) сутыкаліся з ужо існуючымі формамі сацыяльнай арганізацыі і ідэнтычнасці, што не зводзіліся да нацыянальнай катэгорыі. Можна сцвярджаць, што мясцовае насельніцтва навігавала паміж рознымі ідэнтыфікацыйнымі рамкамі.

**Dr. Maxim Karaliou,**
***Baltkrievijas institūts Prāgā***

## Latgales iedzīvotāju nacionālā pašnoteikšanās 20.gs. pirmajā ceturksnī

Nacionālisma pētniecība Centrālajā un Austrumeiropā tradicionāli ir attīstījusies nāciju veidošanās (nation-building) modeļu ietvaros (Miroslavs Hrohs, Benedikts Andersons, Ernests Gellners), kas nacionālismu apraksta kā relatīvi konsekventu un lineāru procesu. Pēdējās desmitgadēs šīs pieejas ir būtiski pārvērtētas Taras Zahras (Tara Zahra), Pītera Džadsona (Pieter Judson) un Mārtena van Ginderahtera (Maarten Van Ginderachter) darbos, kuri piedāvāja "nacionālās indiferences" (*national indifference*) koncepciju un uzsvēra plaisu starp nacionālajiem projektiem un ikdienas praksi.

Latgale kā vēsturiska pierobeža nevar tikt adekvāti izprasta caur lineāras nacionālisma prizmu. Tā vietā uz to ir jāraugās kā uz telpu, kurā nacionālie projekti (latviešu, latgaliešu, poļu, baltkrievu u.c.) sadūrās ar jau eksistējošām sociālās organizācijas un identitātes formām, kas nebija reducējamas līdz nacionālajai kategorijai. Var apgalvot, ka vietējie iedzīvotāji navigēja starp dažādiem identifikācijas rāmjiem. Galvenās šīs navigācijas telpas bija izglītības iestādes, konfesionālās kopienas un lokālās administratīvās struktūras. Turklāt viņu ikdienas dzīvē nacionālā kategorija

